**С. А. Сігаева, Ю. Бас**

# ФАЛЬКЛОРНЫЯ МАТЫВЫ Ў ТВОРЧАСЦІ АДАМА ГЛОБУСА

Народная творчасць – гэта калектыўная і заснаваная на традыцыях творчасць груп або індывідаў, якая прадстаўляе калектыўнае ўяўленне пра свет. Фальклор – сінкрэтычнае мастацтва, з'яўляецца адлюстраваннем культурнай і сацыяльнай самабытнасці народа. Беларуская народная творчасць багатая разнастайнасцю, жанраў і формаў твораў, яна вылучаецца адметнасцю і багаццем высокамастацкіх узораў абрадавай паэзіі, добрай захаванасцю аўтэнтычных формаў, актыўнасцю бытавання, цеснай сувяззю з рэчаіснасцю, захоўвае патрыярхальна сямейныя традыцыі.

На працягу XIX–XX стагоддзяў беларуская фальклорная творчасць эстэтычна разгортвалася ў побытавай прасторы, а сацыяльна была абмежаваная вясковай праблематыкай. Гэта можна абгрунтаваць тым, што да другой паловы 50-х гадоў XX стагоддзя беларускае насельніцтва пераважна пражы-

вала ў вёсках ды мястэчках, да пачатку міграцыйнага руху, калі лікам беларускіх вяскоўцаў колькасць гарадскога насельніцтва з 1950 па 1970 год павялічылася на 57 %. Але развіццё беларускага фальклору не спынілася, а наадварот, набыўшы іншыя формы ды трансфармаваўшыся, працягнула жыць ва ўмовах гарадскога асяроддзя.

Да яркіх прадстаўнікоў сучаснага гарадскога фальклору адносіцца Адам Глобус. Адам Глобус – беларускі пісьменнік, мастак, выдавец. Прадметам даследавання з'яўляюцца фальклорныя матывы ў творах Адама Глобуса. Таксама мы паспрабуем даць ацэнку ўплыву народнай творчасці на дзейнасць пісьменніка.

Разглядаючы канкрэтныя прыклады, варта звярнуцца да аднаго з галоўных вобразаў народнай творчасці – вобраза дамавіка, які досыць часта сустракаецца і ў творах Глобуса. Адам Глобус – прадстаўнік плыні постмадэрнізму ў беларускай літаратуры. Постмадэрнізм – літаратурны кірунак, які прыйшоў на змену мадэрнізму і адрозніваецца ад яго не столькі арыгінальнасцю колькі разнастайнасцю элементаў, цытатнасцю, пагружанасцю ў культуру. «Постмадэрнізм адлюстроўвае складанасць, хаатычнасць, дэцэнтраванасць сучаснага свету, "дух літаратуры" канца дваццатага стагоддзя. Такая літаратура можа разглядацца як літаратура эпохі сусветных войнаў і інфармацыйнага "выбуху". Згаданая плынь сцвярджае сціранне межаў паміж так званым "высокім" і "нізкім" мастацтвам, адмаўляе існаванне рэзкай мяжы паміж літаратурнымі жанрамі, папулярызуе пародыю, калаж, іронію, элементы гульні і інш. У постмадэрнізме "на змену тэрмінам "жанр", "мяжа тэксту" прыходзяць "тэкст" ці "інтэртэкст", што дае мысліўцу свабоду ствараць, грэбуючы патрабаваннямі традыцыі» (І. П. Ільін). Адсюль – постмадэрнісцкі тэкст нельга рацыянальна прааналізаваць, спасцігнуць пры дапамозе пэўных лагічных аперацый. Яго можна толькі эмацыянальна, унутрана адчуць, зразумець шляхам мастацкай інтуіцыі. Адам Глобус выкарыстоўвае інтэртэкст, і, замест вынаходніцтва новых персанажаў, прыводзіць здаўна вядомыя архетыпы, адаптуючы іх пад сучаснасць і гарадское асяроддзе. («У Дамавіка быў твар добра знаёмага чалавека, чыё імя яна ніяк не магла прыгадаць»).

Дамавік (Хатнік, Гаспадар, Падпечнік, Хохлік) – увасабленне духу дома. З усіх беларускіх нячысцікаў ён, верагодна, найбольш блізкі да чалавека. Часцей за ўсё, дамавік – чалавекападобная істота, пакрытая валасамі; старэнькі дзядок; тоўсты, сярэдняга росту чалавек, падобны да гаспадара. Асноўныя абавязкі дамавіка – дагляд за парадкам у хаце і ў гаспадарцы наогул, актыўны ўдзел у сямейным жыцці. Ён спрыяе, дапамагае добрым гаспадарам і вельмі не любіць сварак, п'янства, гучнай гаманы, люстэркаў, масак. Гэтыя схільнасці сведчаць аб яго станоўча-сакральнай прыродзе.

Адамам Глобус жа цалкам пераасэнсаваў вобраз дамавіка. У творы «Дамавікамерон» пачвара паўстае ў вельмі незвычайным амплуа: «На парозе стаяў незнаёмы барадаты мужчына ў чорным скураным паліто і ў капелюшы, насунутым на вочы. Жанчына памкнулася зачыніць дзверы, але госць спыніў яе выразным жэстам рукі ў бліскучай пальчатцы». Дамавік Глобуса –

сапраўдны гаспадар хаты, а менавіта гарадской кватэры. «Дамавік дастаў з глыбокай кішэні свайго скуранога паліто вялізную manicту рознакаліберных ключоў, выбраў патрэбныя, адчыніў замкі і зайшоў у перадпакой, дзе сядзела на падлозе перапалоханая жанчына». «З паліцы Дамавік узяў родную, зразумелую, блізкую кнігу – "Легенды і паданні" з серыі "Народная Творчасць", з яе і прачытаў у сто адзінаццаты раз: "...Гаспадыня, падаіўшы карову, не прамінала пачаставаць яго цёплым малаком..." "Трэба і мне перахапіць нечага". Дамавік уважліва азнаёміўся са змесцівам трохпавярховай лядоўні».

Вобраз істоты максімальна набліжаны да звычайнага чалавека, як гэта і было ў традыцыйным варыянце, сцёртыя нават знешнія адрозненні, хіба што барада захавалася. Гэта досыць лагічна: з трансфармацыяй чалавечага вобразу жыцця, трансфармуюцца і ягоныя фальклорныя спадарожнікі. Пры гэтым прызначэнне Дамавіка не змянілася. Ён апякуецца гаспадарамі, працягваецца хавацца ў цёмных кутах, даглядае за парадкам і прымае ўдзел у сямейным жыцці гаспадароў (а асабліва гаспадынь) кватэры, нават калі гэта датычыцца інтымнай яго часткі.

Разгледзім яшчэ адзін вобраз народнай дэманалогіі. Лясун – валадар лясоў. Абсяг дзейнасці Лесуна – уся лясная плошча ад узлеску да ўзлеску, з усімі ўзгоркамі, нізінамі, ярамі і палянамі, за выключэннем вадаёмаў, дзе маецца асобны нячысцік – Вадзянік. «Хаця Лясун прымае рознае аблічча, ператварацца ў любыя прадметы свайго абсягу, але часцей за ўсё паўстае ў вобразе старога з белым, як бяроста ці як воск, ніколі не загарэлым тварам, з вялізнымі цьмянымі вачыма свінцова-сіняга колеру, якія нерухомыя і ніколі не закрываюцца» (В. А. Васілевіч). Шматаблічнасць Лесуна, асабліва калі ён паўстае ў выглядзе аб'екта жывой прыроды, звязана з міксантрапічнасцю формаў у міфалогіі.

Адам Глобус захаваў за Лесуном ягоныя абавязкі – догляд за лесам, але знешне нячысцік змяніўся: «Лясун быў вусаты, у фрэнчы, з партупеяю, у ботах і фуражцы з лакіраваным брылём. – Так нельга рабіць! – паўтарыў ён і дадаў: – Я – Лясун, сачу за парадкам у лесе. Вы папілі і паелі... А хто фанцікі ад салодкіх плітак будзе прыбіраць? Спачатку прыбярыце, а потым мілуйцеся. Студэнтка і навучэнец пад наглядам Лесуна прыбралі смецце». Як і ў выпадку з Дамавіком, аўтар трансфармуе вобраз ляснога ўладара пад уплывам сучасных культурных працэсаў жыцця, але не змяняе сутнасці персанажа. Лясун выяўляе еднасць чалавека і прыроды. Аўтар дае магчымасць сучаснікам апынуцца на месцы нашых продкаў згодна са светаўспрыманнем якіх, кожны прыродны аб'ект мае душу, адсюль лес – месца напоўненае жывымі істотамі, пакой якіх нельга парушаць.

Таксама Адам Глобус стварае «фальклорныя» вобразы з персанажаў, якія ў грамадскай свядомасці не маюць ніякай сувязі з народнай творчасцю, а хутчэй асацыююцца з савецкім ладам жыцця. Адама Глобус змяшчае ўпраўдомаў, кадравікоў, газавікоў, масавікоў, кіраўнікоў усіх рангаў побач з дамавікамі, як бы параўноўваючы супрацьлеглыя, з першага погляду, вобразы. Вядомы факт, што штуршком для стварэння першых навел «Дамавікамерона» стала здарэнне, што насамрэч мела месца ў жыцці адной са

знаёмых пісьменніка, якая, абмовіўшыся, назвала домакіраўніка дамавіком. У гэтым выпадку аўтар таксама выкарыстоўвае інтэртэкст, бо, як бы дзіўна гэта не гучала, вобраз кадравіка вядомы беларусам так жа, як і вобразы лесуна, вадзяніка, русалкі і іншых персанажаў, згаданых у кнігах Адама Глобуса. Таму у кнігах серыі «Дамавікамерон» яны досыць гарманічна «суіс-нуюць».

Пры чытанні ўзнікае пытанне, чаму Адам Глобус, піша пра такія, здаецца, архаічныя вобразы народнай творчасці, звяртаецца да эратызму. Наогул эратызм – адметнасць творчасці як Глобуса-пісьменніка, так і Глобуса-мастака. Сам аўтар каментуе: «Эротыка мае нейкія асветніцкія, эстэтычныя, лірычныя настроі… Я не раблю творы, якія накіраваны выклікаць полавае ўзбуджэнне. І нават калі я малюю полавы акт, гэта метафара, гэта не фатаграфічныя адбіткі рэальнасці». Таму, можам меркаваць, што аўтар мае асветніцкую і ўзнёсла-мастацкую мэту, ды і наогул эратызм – распаўсюджаны прыём постмадэрнізму.

Сама па сабе народная творчасць – генетычны код кожнага народа, які з’яўляецца падмуркам для будавання гмаху нацыянальнай культуры. «Традыцыі народнай культуры, аб’ядноўваючы ў сваіх законах якасці кансерватыўнасці і пастаяннага аб’наўлення, выбудоўваюцца ў гістарычна шматслойную і разам з тым цэласную сістэму, у якой мінулы вопыт пры неабходнасці можа быць запатрабаваны і адноўлены. Традыцыі не знікаюць, яны захоўваюць сваю жыццёвую сілу на ўзроўні этнічнага светапогляду і свядомасці, адраджаючыся ў былых або іншых формах пры новых спрыяльных умовах» (К. В. Казакова). Беларусы маюць багацейшую фальклорную спадчыну, вывучэнне якой працягваецца і дасюль. Шматлікія пісьменнікі, у тым ліку і Адам Глобус, бачаць у традыцыйным мастацтве крыніцу натхнення і з дапамогай адмысловых мастацкіх прыёмаў працягваюць фальклорную традыцыю.

Адам Глобус – выбітны пісьменнік, які ўлывае на сучасную беларускую літаратуру, а асабліва на стаўленне чытача да яе. Аўтар пераконвае, што нават традыцыйныя персанажы маюць пластычнасць, змяняюцца, набываюць новыя якасці.